**Н.М. Базар (Мінск)**

## Паэтыка санета ў творчасці Галіны Бабарыкі

У пачатку XXI стагоддзя ў беларускай літаратуры з’явіўся шэраг паэтаў, якія абнаўляюць мастацкае бачанне свету і для сваёй творчасці выбіраюць як новыя, так і класічныя мастацкія формы. Сучаснаму паэту вельмі важна, ствараючы новае, не забываць пра літаратурную спадчыну папярэдніх пакаленняў. Сярод такіх аўтараў можна назваць і паэтку са Століншчыны – Галіну Бабарыку.

Асобнае месца ў творчасці Галіны Бабарыкі належыць класічным вершаваным формам: яна выкарыстоўвае санет, трыялет і іншыя. Упершыню ў беларускай літаратуры санет з’явіўся дзякуючы перакладу М. Сматрыцкім аднаго з санетаў Ф. Петраркі на лацінскую і польскую мовы («Фрынас», 1610 год). А першыя беларускія санеты, як вядома, належаць пяру Янкі Купалы: «Жніво», «Па межах родных і разорах…», «Запушчаны палац…» (яны апублікаваны ў 1910 г.). Да 1906 г. беларускі класік напісаў 7 санетаў на польскай мове, усяго ім створана 22 санеты.

Сталую форму санета ўжо шмат стагоддзяў выкарыстоўвалі і нямецкая, і англійская, і французская літаратуры. У нас яны былі не развітыя, амаль не сустракаліся. А, між іншым, менавіта ў такіх формах атрымлівала глыбокае напаўненне думка, павялічвалася роля сцісласці, афарыстычнасці, узрастаў кошт рыфмы. М. Багдановіч прадэманстраваў усё гэта і адрадзіў раней забытыя строгія формы. Жадаючы, каб беларуская літаратура была не горшай, чым іншыя літаратуры свету, ён многа зрабіў для засваення і далейшага развіцця традыцыйных жанравых формаў. У яго паэтычнай скарбонцы налічваецца пяць санетаў на беларускай мове, адзін – на рускай мове. М. Багдановіч зрабіў пераклад санета Я. Купалы на рускую мову і два пераклады санета Поля Верлена і адзін Алексіс-Фелікса Арвера. У нарысе «Санет» паэт прыйшоў да высновы, што ў гэтым вершы дзве самастойныя часткі, прычым у другой падаецца развязка падзей, што апісваюцца ў першай [2, с. 277]. З яго лёгкай рукі санет стаў развівацца і ў пазнейшай літаратуры, набываць важнасць у творах Ул. Жылкі, А. Салаўя, М. Танка, Н. Гілевіча і многіх іншых. Адной з пераемніц традыцый цвёрдай жанравой формы стала Г. Бабарыка.

Галіна Бабарыка нарадзілася ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Магілёўскага педагагічнага інстытута вярнулася працаваць настаўніцай пачатковых класаў у родную вёску Мачуль. Паводле ўласнага прызнання, у школьныя гады яна вельмі любіла беларускую літаратуру і ўжо ў дзесяцігадовым узросце пачала спрабаваць пісаць вершы. Творы Г. Бабарыкі друкуюцца на старонках перыядычных выданняў: у часопісах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Роднае слова», «Пачатковая школа», «Алеся», газетах «Літаратура і мастацтва» і «Беларуская ніва», «Народная газета», друкаваліся яе вершы на старонках абласных газет «Заря» і «Народная трыбуна». Часта вершы паэткі можна сустрэць у раённай газеце «Навіны Палесся». У 2004 годзе выйшаў зборнік яе вершаў «Давер». З 2007 года Г. Бабарыка – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Творы паэтэсы надзвычай лірычныя, напоўненыя любоўю і павагай да роднай зямлі, да непаўторных палескіх краявідаў. Менавіта ў родным краі яна чэрпае натхненне, з яго бярэ і стварае ў вершах цудоўныя, незвычайныя малюнкі. Так, у санеце «Адзінота» Г. Бабарыкай у першай, «катрэннай», частцы верша створаны вобраз адзінокага дрэўца, якое «нахіляюць вятры да зямлі» [1, с. 40], нібыта загадваючы, прызываючы выканаць нечую волю і «адрываюць ад роднай раллі» [1, с. 40]. У «тэрцэтнай» частцы твора аўтар параўнала гэта адзінокае дрэўца з жыццём чалавека, калі яно праходзіць у адзіноце «Так і наша жыццё ў адзіноце / … / Ніткай тонкай на ветры дрыжыць» [1, с. 40]. Але, нягледзячы на тое, што «Хоць звіваецца нітка з дугою, / Ды, напэўна, ніколі не звіць / Сваю думку-трывогу з чужою» [1, с. 40]. Г. Бабарыка прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на агульныя з некім клопаты, ніхто не зможа ў поўнай меры прыняць на сябе клопат, трывогу іншага. Санет напісаны 3-стопным ямбам, рыфмоўка абабабаб ввгдгд. Як відаць, фармальныя прыкметы «тэрцэтнай» часткі санета тут захаваны, хоць назіраюцца парушэнні у «катрэннай» яго частцы.

У санеце «Толькі яна» галоўным з'яўляецца вобраз Божай Маці. Паэтка славіць Яе, выкарыстоўваючы ў якасці рэфрэннага лацінскае слова «Ave» [3, с. 546]. У першай частцы аўтар раіць звяртацца да Яе, адзінай, якая можа дапамагчы, бо яе «Сэрца збалелае сынавай мукай… / Толькі яно так умее нас слухаць» [1, с. 28]. У «тэрцэтнай» частцы мы знаходзім просьбу, ды не проста просьбу, а малітву да Дзевы Марыі, якая зможа адвесці беларускі народ ад «Пошласці, подласці, здрады і мукі» [1, с. 28]. Санет напісаны 4-стопным ямбам, рыфмоўка аббаабба ввгдгд. Фармальныя прыкметы санета захаваны: у санеце налічваецца 14 радкоў, два з іх – катрэны, астатнія два - тэрцэны.

Кажучы пра санет у творчасці Галіны Бабарыкі, можна спыніцца і на вершы «Начны раманс». Чаму? На першы погляд, тут не выкананы асноўныя патрабаванні да санета: у вершы замест 14 – 16 радкоў. Але ў ім можна выдзеліць дзве часткі, якія з'яўляюцца як бы самастойнымі: у першай частцы аўтар малюе прыгожую, казачную ноч, а ў другой – лірычная гераіня супакойваецца тым, што сонца прагоніць цемру, якая навявае сум. Гэты твор

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваёй змястоўнасцю падобны на «арэх-спарыш», з якім параўнаў санет М. Багдановіч.

Хоць сярод двух надрукаваных санетаў Г. Бабарыкі ў зборніку «Давер» няма такіх, якія б адпавядалі ўсім патрабаванням да гэтай устойлівай формы, творы паэткі даюць магчымасць паказаць, што аўтар знаходзіцца на шляху ўдасканалення свайго майстэрства ў напісанні вершаў такога складанага паэтычнага жанру. Яны сведчаць пра асаблівасці таленту Г. Бабарыкі, якія праяўляюцца ва ўменні разважаць як філосаф і аб'ектыўна, рэалістычна глядзець на жыццё. Г. Бабарыка, пішучы вершы, імкнецца да захавання прыкмет класічнага санета. Больш грунтоўныя тэарэтычныя веды гэтай кананічнай формы дапамогуць наблізіцца да стварэння класічнага санета. З гэтага вынікае, што Г. Бабарыка пераймае ўведзеную Янкам Купалам і М.Багдановічам класічную форму санета і пры гэтым робіць спробы захаваць яе фармальныя рысы.

Беларуская паэзія з кожным годам абнаўляецца, дзякуючы прыходу ў літаратуру новых аўтараў. Няхай сярод твораў Г. Бабарыкі не так ужо і шмат санетаў, усё роўна гэта азначае, што традыцыі ў вершатворчасці, закладзеныя вялікімі майстрамі беларускага слова, працягваюцца, і паэты са Століншчыны выкарыстоўваюць іх для стварэння свайго індывідуальнага стылю.

Літаратура

1. Бабарыка, Г. Давер / Г. Бабарыка. – Пінск : КУП "Пінская рэгіянальная друкарня", 2004. – 76 с.

2. Багдановіч, М. Выбраныя творы / М. Багдановіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. – 494 с.

3. Літаратурная карта Берасцейшчыны / А.М. Крэйдзіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А.М. Крэйдзіча. – Брэст : ААТ "Брэсцкая друкарня", 2008. – 568 с.

4. Максім Багдановіч : энцыклапедыя / склад. І.У. Саламевіч, М.В. Трус; рэдкал.: Т.У. Бялова [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 608 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ